**СВІРЫ́ДАВА** Любоў Міхайлаўна (н. 15.2.1939, г. Сярэднеўральск Свярдлоўскай вобл., Расія), расійская фалькларыстка, збіральніца бел. фальклору на Далёкім Усходзе і ў Сібіры. Кандыдат філалагічных навук (1974). Скончыла Адэскі універсітэт (1963). Працавала загадчыкам фалькл. лабараторыі Далёкаўсходняга інстытута мастацтваў, у Інстытуце гісторыі, археалогіі і этнаграфіі Далёкага Усходу. З 1976 у Далёкаўсходнім універсітэце (г. Уладзівасток). Даследуе працэсы фарміравання рэпертуару ўсходнеславянскага, у т.л. беларускага, насельніцтва Далёкага Усходу, асаблівасці бытавання абрадавых і пазаабрадавых лірычных песень у нашчадкаў перасяленцаў з бел. і інш. губерняў. У час фалькл. экспедыцый даследавала бел. фальклор у розных раёнах кампактнага пражывання беларусаў Прыморскага, Хабараўскага і Алтайскага краёў, Амурскай і Новасібірскай абласцей. Разам з Т.Г.Лявонавай і Н.У.Лявонавай прымае ўдзел у рабоце над томам «Беларускі фальклор Сібіры і Далёкага Усходу» (раздзелы «Замовы», «Духоўныя вершы», «Карагодныя песні», «Балады», «Пазаабрадавыя лірычныя песні», «Празаічныя жанры фальклору»). Сабраныя матэрыялы захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Хабараўскага краю і ў рабочым архіве «Збору помнікаў фальклору народаў Сібіры і Далёкага Усходу» Інстытута гісторыі, філалогіі і філасофіі Сібірскага аддзялення Расійскай АН (г. Новасібірск).

*Тв.*: Русские, украинские и белорусские песни на Дальнем Востоке // Русский фольклор Сибири и Дальнего Востока: Материалы и исслед. Улан-Удэ, 1971. Вып. 1; Фольклор Дальнеречья. Владивосток, 1986; У ключика у гремучего: Дальневост. фольклор. Владивосток, 1989.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ